# Святкуем юбілеі



Іван Паўлавіч МЕЛЕЖ



Іван Пятровіч ШАМЯКІН

Сто год мінула з дня нараджэння
вялікіх беларускіх пісьменнікаў,
імёны якіх мы памятаем і шануем і ў наш час...

Прапануем вашай увазе цікавыя факты пра І. П. Мележа і І. П. Шамякіна



Іван Мележ хадзіў у школу ў пасталах, якія сам зрабіў з лазы (пасталы – мяккі сялянскі абутак, часта зроблены з цэлага кавалка скуры, які носіцца з анучамі і прывязваецца да ног аборамі). Тады як астатнім вучням да чацвёртага класа пасталы плялі бацькі.

Мележ сам стварыў драўляны ровар. Колы былі зроблены з двух арэхавых абручоў, але са спіцамі і рамай.

http://martsinovich.of.by/archives/1916



У дзяцінстве Іван Шамякін лоўка навучыўся насіць на галаве стос кніг. Чамусьці гэта вельмі не падабалася бацьку. І той часта дакараў, што сын расце шутам гарохавым.

http://padabayki.ru/bellitaratyra/tsikavyya-fakty-z-zhytstsya-ivana-shamyakina/

## У час вайны Шамякін і Мележ удзельнічалі ў баявых дзеяннях



*І. П. Шамякін*




*І. П. Мележ*

У 1940 годзе Іван Паўлавіч Мележ удзельнічае ў паходах на Бесарабію і Букавіну. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ваяваў пад Нікалаевам і Растовам-на-Доне.



У ліпені 1941 года быў сур'ёзна паранены ў правае плячо пад Растовам і адпраўлены ў шпіталь у Тбілісі. У 1942 годзе скончыў курсы палітработнікаў і быў камандзіраваны ў 51-ю стралковую дывізію супрацоўнікам газеты.

Атрымлівае другое раненне – асколкам бомбы яму раздрабіла правае плячо, і ўсю руку хацелі ампутаваць.
Але знайшоўся хірург, які выратаваў яе. Пасля гэтага пісьменнік атрымаў інваліднасць, і камісія прызнае яго «нягодным да страявой службы».

У 1940–1945 гадах Іван Пятровіч Шамякін служыў у Чырвонай Арміі – удзельнічаў у баях пад Мурманскам, у вызваленні Польшчы, у баях на рацэ Одра.



Мележ пазнаёміўся з будучай жонкай Лідай, калі пасля ранення падарожнічаў у адпачынку.



*І. П. Мележ з сям'ёй*



*І. П. Шамякін з сям'ёй*

Іван Шамякін быў прыкладным сем'янінам і адналюбам. Са сваёй будучай жонкай, Марыяй, ён пазнаёміўся яшчэ ў 5 класе. І ўжо
ў 19 гадоў (1940) ажаніўся з ёй.

http://padabayki.ru/bellitaratyra/tsikavyya-fakty-z-zhytstsya-ivana-shamyakina

Абодва пісьменніка пачыналі свой творчы лёс с паэзіі.
Абодва творцы з’яўляюцца народнымі пісьменнікамі БССР.




*І. П. Мележ*



*І. П. Шамякін*



Іван Шамякін гаварыў, што магіла творцы павінна адлюстроўваць тое, чым займаўся гэты чалавек пры жыцці. І ставіць трэба не скульптуры і пастаменты, а сымбалі, якія б адлюстроўвалі сутнасць творчага свету пісьменніка.

http://padabayki.ru/bellitaratyra/tsikavyya-fakty-z-zhytstsya-ivana-shamyakina



У асяроддзі пісьменнікаў Іван Мележ лічыўся ідэальным суразмоўцам, таму што ён умеў слухаць. Мележ ніколі не перапыняў суразмоўцу нават тады, калі быў нязгодны. Зрабіць жа заўвагу пісьменнік не жадаў, а можа і саромеўся... Сам жа Іван Паўлавіч вёў гутаркі спакойна, разважліва, аргументавана, нібы ўзважваючы кожнае сваё слова, кожную думку. Таму ўсе, хто хоць раз сустракаўся на жыццёвым шляху Мележам, бязмерна даражылі яго словам.

https://multiurok.ru/blog/tsikavyia-fakty-z-zhytstsia-ivana-melezha.html



Мележ і Шамякін былі добрымі сябрамі. Калісь былі суседзямі.



*Іван Мележ, Янка Брыль і Усевалад Краўчанка*

Янка Брыль настолькі быў захоплены і ўражаны раманам Івана Мележа «Людзі на балоце», што вырашыў кінуць працу ў выдавецтве і стаць вольным літаратарам, каб нішто яму не замінала завяршыць свой раман «Птушкі і гнёзды».

https://lit-bel.org/news/nechakanih-fakta-pra-vana-Melezha-6588/



І. П. Шамякін дужа сябраваў з А. Я. Макаёнкам, паважаў яго талент і сілу волі. У рамане «Атланты і карыятыды» пісьменнік выкарыстоўвае вобраз сваяго сябра.



*Іван Мележ і яго старэйшая дачка*

Дачка Людміла ўспамінала, што Мележ НІКОЛІ не павышаў голасу, не праяўляў дыктатарскіх замашак, не надакучаў павучаннямі і забаронамі.

https://lit-bel.org/news/nechakanih-fakta-pra-vana-Melezha-6588/

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971) і аспірантуру пры гэтым універсітэце (1974). З 1974 г. – выкладчык, з 1982 г. – дацэнт кафедры беларускай літаратуры ўніверсітэта.

Аўтар кнігі літаратурнай крытыкі «На лініі перасячэння» (1981). Пераклала на рускую мову аповесці І. Шамякіна «Гандлярка і паэт» (Масква, 1977), «Драма» (часопіс «Нёман», 1989), п'есу «Залаты медаль» (пастаўлена ў 1980), раманы «Вазьму твой боль» (Масква, 1980), «Петраград – Брэст» (Масква, 1985), «Зеніт» (Масква, 1988).




*Таццяна Іванаўна,*
*дачка Івана Шамякіна*

Іван Паўлавіч Мележ быў пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

У 1980 годзе Саюзам пісьменнікаў Беларускай ССР была заснавана літаратурная прэмія імя Івана Мележа.

У Мінску, Хойніках, Лельчыцах, Гомелі названы вуліцы ў гонар Івана Паўлавіча Мележа.






Іван Пятровіч Шамякін быў пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

Мазырскаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту ў 2006 годзе было  прысвоена імя Івана Шамякіна.

У гонар пісьменніка названа адна з вуліц Мінску.